ГІРАЎ УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ

Нарадзіўся ў 1920 годзе ў в Латышава Талачынскага раёна.

У РККА з 15 кастрычніка 1939 года. Камандзір разліку 82 мм мінамёта 69 асобнай стралковай брыгады 7 арміі Ленінградскага фронту, старшы сяржант. Асабіста ўдзельнічаў у абароне горада Ленінграда ў складзе 69 асобнай стралковай брыгады 7 арміі Лениградского фронту. 12 красавіка 1942 года пры адбіцці атакі праціўніка агнём свайго мінамёта знішчыў кулямётны разлік праціўніка, 15 немцаў і 2 агнявыя кропкі, у гэтым баі быў цяжка паранены аскепкам снарада. Пасля выздараўлення працаваў у тыле. Пасля вайны жыў у г. Кемерава. Працаваў старшынёй партыйнай камісіі пры Цэнтральным РК КПСС г. Кемерава. Узнагароды – ордэны: Айчыннай вайны I ступені (1985); «Дружбы народаў» (1981); «Знак Пашаны» (1957); медалі: «За адвагу» (1947); «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 -1945 гг.»; «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне. 1941 -1945 гг.».

Памёр 7 кастрычніка 2000 года.

Крыніцы даведкі:

1. Память народа: [Электронный ресурс]. — Режим доступа: pamyat-naroda.su›awards/anniversaries/1513079710. – Дата доступа: 15.06.2021.

FREE-OFFICE.NET